Таццяна Сапега



Загадчык сектара
Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

# Х Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні

Марыя Шопіна



Галоўны бібліятэкар
Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі,
магістр гуманітарных навук

Кнігазнаўчыя чытанні, якія праводзяцца з 1998 г., ужо даўно сталі адным з галоўных мерапрыемстваў, што гуртуе даследчыкаў і спецыялістаў розных краін, якія працуюць з кніжнымі помнікамі – важнейшымі складнікамі культурнага і інфармацыйнага патэнцыялу нацыі, што дазваляе захаваць пераемнасць інтэлектуальнага вопыту паміж пакаленнямі.

Х Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні праходзілі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі 17–18 красавіка 2014 г. Арганізатарамі канферэнцыі з'яўляліся Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

Нагадаем, што леташнія, IX Кнігазнаўчыя чытанні, былі прысвечаны 425-годдзю зацвярджэння Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. Тады дакладчыкі прадставілі даследаванні па Статутах Вялікага Княства Літоўскага як помніках кніжнай і прававой культуры. Сёлетнія Кнігазнаўчыя чытанні былі прысвечаны 440-годдзю выдавецкай дзейнасці аднаго з найбольш адметных беларускіх выдавецкіх цэнтраў XVI – пачатку XVII ст. – друкарні Мамонічаў. Прысвячэнне канферэнцый пэўнай гістарычнай даце мае даўнія традыцыі і дазваляе зрабіць акцэнт на значнай падзеі для беларускай гісторыі і культуры, прыцягнуць увагу навуковай і грамадскай супольнасці да тэмы, адлюстраваць узровень і стан яе навуковай распрацаванасці.

Кнігазнаўчыя чытанні традыцыйна збіраюць даследчыкаў кнігі з розных краін свету. Х Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні аб'ядналі кнігазнаўцаў, лінгвістаў, літаратуразнаўцаў, культуролагаў, гісторыкаў, філосафаў і правазнаўцаў з Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны і Чэхіі. Вядомыя навукоўцы прадставілі вынікі найноўшых даследаванняў па гісторыі выдавецкай дзейнасці Францыска Скарыны і Пятра Мсціслаўца, друкарні Мамонічаў, друкаванай і рукапіснай традыцыях беларускай кніжнай культуры XVI–XIX стст.

У рамках Х Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў праходзіла пленарнае пасяджэнне, а таксама чатыры секцыі: «Вытокі беларускага кнігадрукавання: Францыск Скарына», «Друкарня Мамонічаў – найбуйнейшая прыватная друкарня Вялікага Княства Літоўскага», «Кніжная спадчына Беларусі XVI–XVII стст.» і «Традыцыі беларускай кніжнай культуры XVII–XIX стст.».

Значная частка дакладаў на сёлетніх чытаннях была прысвечана спадчыне Францыска Скарыны. Актуальнасць гэтай тэмы больш чым відавочная, бо ў 2017 г. Беларусь будзе адзначаць 500-годдзе беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання. Пленарнае пасяджэнне пачалося з даклада «Факсімільнае ўзнаўленне кніжнай спадчыны Францыска Скарыны» намесніка дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі А.А. Сушы. Дакладчык распавёў пра распрацоўку комплекснай праграмы мерапрыемстваў па падрыхтоўцы святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, адной з галоўных задач якой стане факсімільнае ўзнаўленне кніжнай спадчыны беларускага першадрукара.

Дацэнт філасофскага факультэта Карлавага ўніверсітэта ў Празе Пётр Войт прадставіў даклад «Пражская книжная культура в период деятельности Франциска Скорины», у якім выказаў шматлікія гіпотэзы па выкарыстанні беларускім першадрукаром друкарні ў Празе, стварэнні ілюстрацый пражскімі мастакамі пад непасрэдным кантролем Ф. Скарыны і інш. Навуковец падсумаваў, што Ф. Скарына прапанаваў новыя падыходы да выдання Біблії і стварэння біблейскіх ілюстрацый, якія раней не прымяняліся на тэрыторыі Чэхіі.

На секцыі «Вытокі беларускага кнігадрукавання: Францыск Скарына» з грунтоўнымі дакладамі выступілі загадчык навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Г.У. Кірзева («О происхождении коллекции книг Ф. Скорины в фонде Национальной библиотеки Беларуси»), загадчык аддзела археаграфіі Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы Валерый Сямёнавіч Пазднякоў («Ініцыялы Пражскай Біблії Скарыны»), вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь І.М. Зварыка («Гравюра Скарыны з Кнігі прарока Данііла. Скрытыя матывы. Тэкст перакладу і яго мастацкая інтэрпрэтацыя») і інш.

Дасягненні кнігадрукавання XVI–XVII стст., здзейсненыя ў складаным сінтэзе і ўзаемадзеянні розных культур, мелі значны ўплыў на далейшае развіццё нацыянальнай культуры Беларусі. Адным з найбольш яскравых прадстаўнікоў гэтага перыяду з'яўляюцца купцы Кузьма і Лявон Мамонічы, якія ў 1574 г. заснавалі прыватную друкарню ў Вільні. На пленарным пасяджэнні і секцыі «Друкарня Мамонічаў – найбуйнейшая прыватная друкарня Вялікага Княства Літоўскага» былі прадстаўлены даклады, прысве-



чаныя выдавецкай дзейнасці Мамонічаў. Загадчык аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Навуковай бібліятэкі імя М. Горкага Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта А.А. Савельеў у сваім дакладзе «Белорусские кириллические издания XVI в. в Научной библиотеке Санкт-Петербургского университета: история формирования коллекции» расказаў пра калекцыю беларускіх кірылічных выданняў XVI ст., якая ўтрымлівае 32 асобнікі 17 выданняў 1569–1600 гг., і крыніцы яе фарміравання ў XIX–XX ст. Загадчык аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Дзяржаўнай публічнай навукова-тэхнічнай бібліятэкі Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук А.Ю. Барадзіхін у дакладзе «Книги типографии Мамоничей в старообрядческих библиотеках Сибири и Дальнего Востока» распавёў пра археалагічныя экспедыцыі, якія і сёння з'яўляюцца галоўнай крыніцай камплектавання бібліятэчных фондаў рукапіснымі і старадрукаванымі кнігамі. Вынікамі археалагічных знаходак былі кнігі Мамонічаў. У дакладзе «Польские издания типографии Мамоничей в библиотеке Вильнюсского университета» В. Вайткявічутэ, старшы бібліятэкар бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта, прадставіла 18 польскіх выданняў (25 асобнікаў) друкарні Лявона Мамоніча. Найбольшую ўвагу даследчыца звярнула на асаблівасці выданняў і правененцыі. Старшы навуковы супрацоўнік аддзела старадрукаў і рэдкіх выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Украіны імя У.І. Вярнадскага Н.П. Бондар выступіла з дакладам «Особенности бумаги вильнюсского Служебника типографии Мамоничей 1583 г.»).

Секцыі «Кніжная спадчына Беларусі XVI–XVII стст.» і «Традыцыі беларускай кніжнай культуры XVII–XIX стст.» уключалі даклады, прысвечаныя друкаванай і рукапіснай традыцыям беларускай кніжнай культуры XVI–XIX стст. З замежных навукоўцаў з дакладамі выступілі загадчык сектара метадалогіі міждысцыплінарных даследаванняў чалавека Інстытута філасофіі Расійскай акадэміі навук М.С. Кісялёва («Симеон Полоцкий и книжная культура Москвы второй половины XVII в.»), вядучы і старшы навуковыя супрацоўнікі аддзела ўсходняга славянства Інстытута славяназнаўства Расійскай акадэміі навук Ю.А. Лабынцаў і Л.Л. Шчавінская, саветнік генеральнага дырэктара Усерасійскай дзяржаўнай бібліятэкі замежнай літаратуры імя М.І. Рудаміна І.У. Зайцаў («Новая рукопись белорусских татар»), навуковы супрацоўнік Нацыянальнай бібліятэкі Польшчы Т. Швацінскі («Инвентарь рукописей Библиотеки Залусских как источник изучения книжной культуры Великого княжества Литовского»).

Нацыянальную бібліятэку Беларусі на канферэнцыі з дакладамі прадставілі таксама загадчык сектара музейнай дзейнасці навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Т.М. Захарава («Выданні XVI – пачатку XVII ст. гістарычнай хронікі Аляксандра Гваніні ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі»), галоўны бібліёграф навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Т.У. Карнілава («Аксіясфера «Малой падарожнай кніжкі» Францыска Скарыны»), рэдактар выдавецкага аддзела А.П. Паршына («Становление редакторского мастерства в восточнославянских землях XVI–XVII вв.»), вядучы бібліятэкар навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Т.І. Рошчына («Беларускія старадрукі XVI–XVII стст. лацінскім шрыфтам у польскіх сховішчах»), галоўны бібліёграф навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства К.В. Суша («Вытокі энцыклапедычнай культуры Беларусі»), галоўны бібліятэкар навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства М.М. Шопіна («Выданні Лявона Мамоніча з фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі»).

У рамках X Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў адбылося адкрыццё выставы «Надрукавана ў доме Мамонічаў», якая была арганізавана ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі сумесна з Цэнтральнай навуковай бібліятэкай імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У экспазіцыі ўпершыню быў прадстаўлены найбольш поўны збор старадрукаў друкарскага дома Мамонічаў канца XVI – пачатку XVII ст. (11 асобнікаў 11-ці выданняў) з фондаў двух буйнейшых захавальніц нацыянальнага кніжнага скарбу краіны.